Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 ЖНІЎНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 146 (28004) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**З днём нараджэння, Брэст!**

СТАР. 2



**Поле для маніпуляцый?**



**Мы ўжо ў працэсе. Балонскім**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**4,4%**

*ВУП склаў прафіцыт рэспубліканскага бюджэту краіны ў першым паўгоддзі, або Br17,9 трлн, што адпавядае запланаваным параметрам бюджэту. Даходы рэспубліканскага бюджэту за гэты час склалі Br76,7 трлн (49%). За студзень—чэрвень паступленне ПДВ склала Br35,3 трлн, або 46,4% удакладненага гадавога плана. Падатку на прыбытак паступіла Br6,9 трлн (32,2%). Акцызы паступілі ў суме Br8,9 трлн (42,6%). Даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці склалі Br19,9 трлн (51,3%), паступлення ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва — Br50,5 трлн (43,6%). Расходы рэспубліканскага бюджэту склалі ў суме Br58,8 трлн (41,7%).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.08.2015 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 15345,00 ▲ |
| Еўра | 16864,00 ▲ |
| Рас. руб. | 245,86 ▼ |
| Укр. грыўня | 710,42 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Хлебны дождж

Хлебныя палеткі пад вёскай Гайна знаходзяцца на самых высокіх пунктах Лагойскага ўзгор'я, і камбайны ў час жніва то караскаюцца, то хаваюцца за пагорак. Але механізатары прывыклі да гэтых вышынь. Хлебаробам СГЦ «Гайна» Мінскага трактарнага завода даводзіцца пачынаць сёлетняе жніво менавіта на... схілах. Не ўпершыню даводзіцца і сеяць, і ўбіраць спелы хлеб і камбайнеру Яўгену ЛУКШЫЦУ *(на фота)* — лідару леташняга жніва ў гаспадарцы і па раёне. З пачатку сёлетняй уборкі экіпаж Яўгена Лукшыца і яго памочніка Дзмітрыя Тарасевіча намалаціў каля 300 тон азімага трыцікале, рапсу і пшаніцы. Малады механізатар, ён жа — брыгадзір трактарнай брыгады ў аддзяленні Лагаза, падстаўляючы свае далоні пад збожжавы струмень, кажа: «Такі хлебны дождж нам вельмі патрэбен!» СТАР. 4



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Рэха падзеі

## БЛАКІТНЫЯ БЕРЭТЫ ЯК СІМВАЛ МІРНАГА НЕБА

### Дзень дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый з размахам адзначылі ў краіне

**Святочныя мерапрыемствы прайшлі ва ўсіх злучэннях і воінскіх часцях сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл. Урачыстасці адбыліся і на гарадскіх вуліцах. Дэсантнікі паказвалі сваё майстэрства ў рукапашнай, выконвалі скачкі з парашутам і дэманстравалі іншыя навыкі; мінчане і госці сталіцы не зводзілі вачэй з узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, прадстаўленай на выставе; мастацкія калектывы прымусілі спяваць і танчыць ледзь не кожнага.** СТАР. 3



Фота БЕЛТА.

■ Надвор'е

## ЛЕТА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

### Сёння ў сувязі з гарачынёй сіноптыкі аб'явілі аранжавы ўзровень небяспекі

**Гарачае і сухое надвор'е ўстановіцца ў Беларусі ў першы тыдзень жніўня. Аб гэтым паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Дзмітрый РАБАЎ.**

Ён таксама адзначыў, што сярэдняя тэмпература паветра ў першай дэкадзе жніўня чакаецца на 3-5 градусаў вышэйшай за норму. Месячная колькасць ападкаў у жніўні 2015 года чакаецца ў межах сярэдніх шматгадовых значэнняў, месцамі большай за норму. СТАР. 2

# ШЛЯХІ ДА ПАЎНАЦЭННАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Праблемных пытанняў у адносінах Беларусі і ЗША менш, чым збліжальных фактараў

**Такую думку выказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў Мінску з дэлегацыяй кангрэсменаў ЗША, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«І нават у гэты складаны час беларуска-амерыканскія адносіны не спыняліся. Узаемадзейнічалі мы заўсёды па пытаннях забеспячэння глабальнай і рэгіянальнай бяспекі, што вельмі актуальна сёння, прадухілення незаконнага транзіту ядзерных матэрыялаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што беларускі бок цэніць падтрымку сваіх ініцыятыў у ААН і гатоўнасць Злучаных Штатаў садзейнічаць далучэнню Беларусі да Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

«Лічу, што нам трэба будаваць адносіны паміж ЗША і Беларуссю не па сродках масавай інфармацыі, а непасрэдна вывучаючы становішча ў краінах, і рабіць з гэтага адпаведныя высновы», — лічыць беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў амерыканскіх кангрэсменаў выказаць свае заўвагі. «Мы не любім, калі нас штурхаюць у спіну, мы ніколі не пагодзімся з тым, калі нам навязваюць сілай нейкую волю. Але мы добрыя вучні. Калі вы нам прапануеце варыянты, якія будуць рухаць нашу краіну да суверэнітэту, большай незалежнасці, калі вы нам прапануеце варыянты, якія будуць паляпшаць жыццё беларускага народа, мы будзем вам вельмі ўдзячны і неадкладна возьмем іх на ўзбраенне», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што апошнім часам кантакты паміж Беларуссю і ЗША, уключаючы абмен візітамі афіцыйных і дзелавых дэлегацый, значна актывізаваліся. Працягваецца ўзаемадзеянне паміж беларускімі і амерыканскімі праваахоўнымі органамі, наладжваюцца міжрэгіянальныя сувязі, развіваецца супрацоўніцтва ў галіне навукі, культуры і адукацыі. Паступова расце двухбаковы тавараварот. «Мы разумеем, што без яго ніякіх адносін паміж дзяржавамі быць не можа, таму што эканоміка — гэта фундамент любых адносін», — упэўнены ён.

«ЗША для нас — шматабяцальны гандлёвы партнёр і інвестар, і мы гэтага не ўтойваем. Мы зацікаўлены ў атрыманні доступу беларускіх вытворцаў да плацежаздольнага, ёмістага амерыканскага рынку. Узаемна гатовы зрабіць усё для таго, каб камфортна было працаваць вам тут, у Беларусі», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў таксама зацікаўленасць беларускага боку ў прыцягненні інвестыцый, развіцці вытворчай кааперацыі, атрыманні крэдытных рэсурсаў. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, амерыканскія карпарацыі праяўляюць да Беларусі ўсё большую цікавасць, у тым ліку ў сувязі з пэўнымі перавагамі, якія дають стварэнне Мытнага саюза і ўдзел Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Сёння ў Беларусі працуе амаль 400 прадпрыемстваў з амерыканскім капіталам. «Аднак упэўнены, што патэнцыял нашага эканамічнага супрацоўніцтва значна большы», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што знаходжанне амерыканскіх кангрэсменаў на беларускай зямлі пакіне ў іх добрае ўражанне аб краіне, людзях, а сустрэчы, запланаваныя ў час візіту, дапамогуць бакам бліжэй спазнаць адзін аднаго.

«Мы абсалютна нічога не ўтойваем ад вас. Усё, што вы жадаеце ўбачыць у Беларусі, тая магчымасць, якая будзе вам прапанавана, дасць магчымасць скласці цэласнае ўражанне аб нашай краіне. Вы можаце знаходзіцца ў Беларусі столькі, колькі вам захочацца, пакуль сапраўды ў вас не складзецца цэласнае ўражанне: няхай у чымсьці негатыўнае, у чымсьці пазітыўнае, але гэта будзе ваша ўражанне аб нашай краіне», — адзначыў беларускі лідар.

Член Палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША ад штата Каліфорнія Дана Рарабакер адзначыў уклад Беларусі ў вырашэнне сітуацыі ва Украіне. «Нам неабходна супрацоўнічаць, і сёння нам неабходны мір і дабрабыт ва ўсім свеце», — сказаў ён. «І калі нашы ўрады будуць супрацоўнічаць, мы можам зрабіць гэта магчымым», — лічыць кангрэсмен. У прыватнасці, Дана Рарабакер адзначыў, што хацеў бы супрацоўнічаць з беларускім бокам для выпрацоўкі рэкамендацый па тым, як дасягнуць міру ва Украіне. «Я хацеў бы адзначыць пазітыўны ўклад беларускіх улад у сітуацыю дзеля ўстанаўлення міру і вырашэння канфлікту ва Украіне», — сказаў ён.

■ З нагоды

# КАРНАВАЛ ПА-БЕРАСЦЕЙСКУ



## Свой 996-ты дзень нараджэння Брэст адзначыў ярка і крэатыўна

**Так, упершыню ў горадзе над Бугам прайшоў сапраўдны карнавал. У святочным шэсці прынялі ўдзел усе ахвотныя. «Сёлета мы распачалі новую традыцыю — правядзенне Берасцейскага карнавала. У будучыні плануем надаць яму нацыянальную афарбоўку. Гэта можа стаць нашай турыстычнай фішкай», — адзначыў старшыня Брэсцкага гарвыканкама. Аляксандр Рагачук павіншаваў берасцейцаў са святам і адзначыў, што зусім трохі засталося да мілeніуму абласнога цэнтра. «Трэба прыкласці максімум намаганняў, каб наш горад стаў больш камфортным, утульным, еўрапейскім».**



**Аляксандр Рагачук: «Берасцейскі карнавал плануем праводзіць штогод у Дзень горада».**

З Днём горада Брэст прыехалі павіншаваць дэлегацыі 20 гарадоў-пабрацімаў з Расіі, Украіны, Польшчы, Славакіі, Грузіі, Францыі, Латвіі. Са сваімі партнёрамі абласны цэнтр падтрымлівае адносіны не на паперы, а з дапамогай эканамічных і сацыяльных праектаў. «Асаблівы акцэнт мы зараз робім на супрацоўніцтве з грузінскім Батумі, ёсць вялікія рэзервы для нашага ўзаемадзеяння. З польскімі калегамі ажыццяўляем шмат праектаў у рамках праграмы «Еўрарэгіён «Буг». Ёсць таксама канкрэтныя планы па працы з Іжэўскам, Петразаводскам», — падкрэсліў старшыня Брэсцкага гарвыканкама.

Святочныя гулянні разгарнуліся на шматлікіх пляцоўках, цэнтрам якіх стала пешаходная вуліца Савецкая. Арганізатары падрыхтавалі для гараджан забавы на любы густ і ўзрост. Вуліца была падзелена на некалькі кварталаў. Напрыклад, гледачы воінскага квартала маглі атрымаць асалоду ад ваенна-спартыўных шоу для сапраўдных мужчын. У дзіцячым квартале «Горад будучыні» маленькіх жыхароў Брэста чакалі гульні, конкурсы, віктарыны.

Яшчэ адной запамінальнай фішкай свята горада стаў велапарад на шпільках. Па вуліцах Брэста праехалі больш за 200 прадстаўніц прыгожага полу. Прычым мерапрыемства атрымала статус міжнароднага, паколькі да гараджанак далучыліся і жыхаркі польскага Любліна. Удзельніцы ўпрыгожылі сябе і свае веласіпеды жывымі і штучнымі кветкамі, зробленымі з паперы, пацерак, паветраных шароў. Праехаўшы па галоўных вуліцах Брэста, дзяўчаты фінішавалі на набярэжнай ракі Мухавец. Там для іх была арганізавана забаўляльная праграма з майстар-класамі, вясёлымі конкурсамі і гульнямі. Самых крэатыўных чакалі падарункі. Завяршылася акцыя святочным чаяваннем на цеплаходзе.



Фота БЕЛТА.

Між тым Брэст не збіраецца адпачываць пасля Дня горада: актыўна рыхтуецца да папулярнага міжнароднага тэатральнага фестывалю «Белая вежа», які пройдзе з 11 па 19 верасня. У 20-м па ліку тэатральным форуме прымуць удзел калектывы з 15 краін, у тым ліку з Балгарыі, Германіі, Ізраіля, Таджыкістана, Туніса, Чэхіі. Гледачы ўбачаць 25 драматычных, лялечных, музычных, вулічных і пластычных спектакляў на рускай, беларускай, а таксама на балгарскай, англійскай, літоўскай, туніскай, украінскай мовах з перакладам. Не прапусціце!

**Надзея ПАЎЛАВА.**

# ЛЕТА ПРАЦЯГВАЕЦЦА



Фота Юрыя ГОРЫДА.

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

У аўторак і сераду будзе без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе 12-19 градусаў вышэй за нуль, удзень — плюс 27-34 градусы. У чацвер таксама ападкі не прагназуюцца. Уначы — 13-20 градусаў цяпла, удзень чакаецца 28-34 градусы, па паўднёвым захадзе месцамі да плюс 35. У пятніцу ў асобных раёнах магчымы кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Уначы —14-21 градус цяпла, удзень — 28-34 градусы вышэй за нуль, па паўднёвым захадзе — да плюс 36.

На выхадных установіцца анамальна гарачае надвор'е. У суботу пераважна без ападкаў. Уначы — 14-21 градус вышэй за нуль, удзень — 30-36 градусаў цяпла. У нядзелю ў асобных раёнах, пераважна па поўначы, пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы — 15-22 градусы цяпла, днём — 30-36 градусаў.

■ Азбука бяспекі

# СПЁКА ЗНОЎ «ЗАЧЫНЯЕ» ЛЯСЫ І... ПАЛЯВАННЕ

**У краіну вяртаецца спёка, у сувязі з чым на большай частцы тэрыторыі зноў павялічваецца клас пажарнай небяспекі. І лесагаспадарчыя ўстановы зноўку ініцыююць увядзенне забароны на наведванне лясоў. Такое даручэнне даў учора падчас аператыўнай нарады <u>міністр лясной гаспадаркі Міхаіл АМЕЛЬЯНОВІЧ.</u>**

Забароны на наведванне лясоў дзейнічаюць на ўсёй тэрыторыі Брэсцкай вобласці, у Буда-Кашалёўскім, Рэчыцкім, Ельскім, Брагінскім, Лельчыцкім, Чачэрскім і Кармянскім раёнах Гомельскай вобласці, Любанскім, Мінскім, Дзяржынскім і Чэрвеньскім раёнах Мінскай вобласці.

Апроч таго, як паведамляе прэс-служба Мінлясгаса, яно выйдзе з ініцыятывай аб пераносе тэрміну адкрыцця сезона палявання на вадаплаўную дзічыну (акрамя гусей) і балотную, слонку, вехіра шызага, перапёлку, фазана, якое павінна было распачацца 8 жніўня.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703 | | | |
| **Продавец** | Копыльское районное потребительское общество, г. Копыль, пл. Ленина, 21 | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| **Наименование** | **Назначение** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| Магазин «Престиж» | Здание специализированное розничной торговли | 53,9 кв.м | 642/С-11412 | Минская обл., Копыльский р-н, г. Копыль, пл. Ленина, 23Б |
| **Сведения о земельном участке:** | 18/25 доли земельного участка пл. 0.0087 га предоставлены продавцу на праве аренды сроком по 11.05.2030 для размещения объектов розничной торговли (для обслуживания магазина с подвалом) | | | |
| ***Начальная цена с НДС 20 % – 444 000 000 белорусских рублей.*** | | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки». | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона. | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи. Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by. | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | 04.09.2015 в 12ч. 00 мин по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | 02.09.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». | | | |
| **Контактные данные** | **Тел. +375-17-280-36-37, +375-29-183-69-71,** Email: auction@cpo.by, www.cpo.by. | | | |

# БЛАКІТНЫЯ БЕРЭТЫ ЯК СІМВАЛ МІРНАГА НЕБА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Роўна 85 гадоў таму — 2 жніўня 1930 года — на вучэннях Ваенна-паветраных сіл Маскоўскай ваеннай акругі пад Варонежам былі парашутаваны дванаццаць першых дэсантнікаў. Эксперымент, што называецца, атрымаўся. Перад узброенымі сіламі адкрыліся перавагі новага віду войск і іх вялікія магчымасці. Што сёння ўяўляюць сабой сілы спецыяльных аперацый, мінчане і госці сталіцы змаглі ўбачыць у мінулыя выхадныя.

Традыцыйна афіцыйныя мерапрыемствы пачаліся з ускладання кветак да стэлы «Мінск — горад-герой». Воіны-дэсантнікі ўнеслі вялікі ўклад у Перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне. За баявыя заслугі ўсім паветрана-дэсантным злучэнням прысвоілі званне гвардзейскіх, а 296 дэсантнікаў былі ўдастоены самай высокай узнагароды — зоркі Героя Савецкага Саюза. Годна праявілі сябе дэсантнікі і падчас вайны ў Афганістане. Вайскоўцы 103-й гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі 334-га асобнага атрада спецыяльнага прызначэння 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння аднымі з першых увайшлі ў Афганістан. Менавіта яны апошнімі пакінулі гэтую краіну.

Больш падрабязна даведацца аб мінулым і сучасным паветрана-дэсантных войск можна ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дзе напярэдадні Дня дэсантніка адкрылася выстава «85 гадоў на абароне Айчыны». У экспазіцыі прадстаўлены фотадымкі дэсантнікаў — ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, воінаў-інтэрнацыяналістаў, майстроў парашутнага спорту, а таксама ўзоры стралковай зброі, бронекамізэлькі і ахоўныя шлемы, парашутныя сістэмы, сродкі сувязі, вадалазны рыштунак, экіпіроўка і іншая ваенна-тэхнічная маёмасць, якая ў розны час знаходзілася на ўзбраенні паветрана-дэсантных войск і сіл спецыяльных аперацый.

У парку Перамогі, дзе разгарнулася выстава сучаснай ваеннай тэхнікі і ўзбраення сіл спецыяльных аперацый, прайшла і паказальная частка. Воіны-дэсантнікі скакалі з парашутамі, дэманстравалі спрытнасць рук і баявую загартоўку, а таксама інсцэніравалі баявыя дзеянні на вадзе. Наўрад ці Камсамольскае возера, на якім адбылося ўнікальнае відовішча, памятае такое!

«Паколькі дэсант — гэта значна больш, чым ваенная служба, для многіх маладых людзей, якія прайшлі выпрабаванне небам і зямлёй, ён стаў брацтвам, заснаваным на мужнасці, адвазе і гонары», — адзначыў старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарстнёў на ўрачыстым мітынгу. Ён падкрэсліў, што нямала яркіх старонак упісала ў летапіс Узброеных Сіл 103-я гвардзейская паветрана-дэсантная дывізія (яе ратную славу цяпер прадаўжаюць воіны 103-й гвардзейскай асобнай мабільнай брыгады, якая месціцца ў абласным цэнтры). «Віцебскія дэсантнікі прымалі ўдзел ва ўсіх буйнамаштабных вучэннях Узброеных Сіл Беларусі, сумесных з Расіяй аператыўна-стратэгічных вучэннях груповак войскаў «Захад-2009» і «Захад-2013». Цяпер разам з расійскімі калегамі 103-я гвардзейская асобная мабільная брыгада рыхтуецца да высадкі дэсанта на Паўночны полюс», — сказаў старшыня Віцебскага аблвыканкама.



Фота БЕЛТА.

Мікалай Шарстнёў падзякаваў ваенным за вернасць Айчыне і гатоўнасць у любы момант зноў стаць на абарону яе інтарэсаў. «І няхай вашы блакітныя берэты заўсёды застаюцца для людзей сімвалам мірнага неба,



якое знаходзіцца пад надзейнай аховай дэсанта. А баявы дэвіз дэсантнікаў «Ніхто, акрамя нас!» заўсёды натхняе на самаадданае служэнне Радзіме», — рэзюмаваў старшыня аблвыканкама.

Воіны-дэсантнікі вядуць значную работу і па ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі. На базе злучэння штогод праводзяцца Дні прызыўніка, Дні адчыненых дзвярэй, ваенна-спартыўныя мерапрыемствы. Разам з тым падтрымліваюць цесныя адносіны з ветэранамі паветрана-дэсантных войскаў, ветэранамі вайны ў Афганістане.

У мітынгу ўдзельнічалі прадстаўнікі Міністэрства абароны, мясцовых органаў улады, духавенства, грамадскіх арганізацый, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і Узброеных Сіл. Найлепшыя вайскоўцы і ветэраны часці атрымалі ўзнагароды. У цэнтры Віцебска на плошчы Перамогі гараджане маглі падзівіцца на баявую тэхніку і ўзбраенне, а таксама ваенную форму розных гістарычных перыядаў. Там жа прайшлі паказальныя выступленні воінскіх падраздзяленняў мабільнай брыгады і пазаштатнай роты ганаровай варты.

З размахам адсвяткавалі Дзень дэсантніка і на базе 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння ў Мар'інай Горцы, а таксама ў Брэсце (святкаванне сёлета прайшло не на тэрыторыі 38-й гвардзейскай асобнай мабільнай брыгады, а на вяслярным канале). З канцэртам выступіла рота ганаровай варты, байцы аднаго з батальёнаў і разведчыкі прадэманстравалі элементы рукапашнага бою, традыцыйныя сілавыя і акрабатычныя нумары. У бакі ляцелі аскепкі пабітых аб галаву бутэлек, сілікатных блокаў, шыферу. Не абышлося і без інсцэніроўкі баявога эпізоду. Па сцэнарыі мабільнае падраздзяленне зрабіла налёт на лагер праціўніка, дзе вораг утрымліваў закладнікаў. Да ўмоўнага суперніка дэсантнікі эфектна падплылі на БТРах, пераадолеўшы ўчастак на вяслярным канале.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*
**Надзея ПАЎЛАВА.**

## Прамая лінія

### А ВАШ ЦІСК — ПАД КАНТРОЛЕМ?

Скача артэрыяльны ціск? Не можаце знізіць узровень халестэрыну? Не ведаеце, колькі часу можна працаваць на дачы з дыягназам «артэрыяльная гіпертэнзія»? Пра ўсе асаблівасці дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі артэрыяльнай гіпертэнзіі, стэнакардыі, ішэмічнай хваробы сэрца, інфаркту міякарда можна будзе запытаць у **загадчыцы інфарктнага аддзялення №2 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, урача-кардыёлага вышэйшай катэгорыі Наталлі Якаўлеўны ПАЛЯЎКОВАЙ** падчас «прамой лініі», патэлефанаваўшы ў рэдакцыю нашай газеты ў чацвер, **6 жніўня,** з 14.00 да 15.00 па нумары **(8017) 287 18 71**.

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумары **(8017) 287 18 29**.

## Будзь у курсе!

### ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

**У краіне з пачатку месяца дзейнічаюць новыя правілы перавозкі пасажыраў, багажу і грузаў чыгуначным транспартам агульнага карыстання.**

Дакументам вызначаны парадак афармлення, пераафармлення і праезду па праязных дакументах (білетах), паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі. Так, пры пераафармленні праязнога дакумента на цягнік, што адыходзіць раней, у выпадку змяншэння кошту праезду пасажыру вяртаецца розніца ў кошце білета. Дагэтуль розніца кошту праезду ў такіх выпадках не вярталася.

З 1 жніўня афармленне абанементных білетаў «рабочага дня» будзе весціся без указання прозвішча, імя і імя па бацьку. Гэта азначае, што праязны білет будзе афармляцца без прад'яўлення дакумента, які сведчыць асобу. Апроч таго, вяртанне грашовых сродкаў за нявыкарыстаныя абанементныя білеты будзе ажыццяўляцца па заяве пасажыра, без прад'яўлення дакументаў, што пацвярджаюць прычыну вяртання.

**Сяргей РАСОЛЬКА** *rs@zviazda.by*

## Спорт-тайм

# НАША ЗАЛАТАЯ МОЛАДЗЬ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» расказвае пра вынікі выступлення беларускіх спартсменаў на Еўрапейскім юнацкім алімпійскім фестывалі, пра ўдзельнікаў 1/8 Кубка Беларусі па футболе і пра тое, хто прыме зімовыя Алімпійскія гульні ў 2022 годзе.**

**1. По выніках выступлення на XIII Еўрапейскім юнацкім алімпійскім фестывалі ў грузінскім Тбілісі нашы спартсмены заваявалі 7 медалёў:** 3 залатыя і 4 бронзавыя. Пераможцамі фестывалю сталі прадстаўнікі лёгкай атлетыкі Ігар Зубко і Таццяна Рамановіч, а таксама гімнаст Ягор Шарамкоў. На трэцюю прыступку п'едэстала падымаліся нашы суайчыннікі Уладзіслаў Булахаў, Вадзім Чарнышоў, Дзмітрый Бараўкоў (усе — лёгкая атлетыка) і Ягор Кухарэнка (дзюдо).

Такім чынам, у агульнакамандным заліку зборная Беларусі заняла 14-е месца. Пераможцай стала зборная Расіі, спартсмены якой заваявалі 37 медалёў.

**2. Гандбалісты маладзёжнай (U-21) зборнай Беларусі занялі 6-е месца на чэмпіянаце свету-2015,** які завяршыўся ў Бразіліі. У чвэрцьфінале нашы спартсмены не змаглі перайграць аднагодак з Германіі. Падчас суцяшальнага турніру за 5-8-е месцы беларусы перамаглі каманды Іспаніі і Катара, але не змаглі давесці да такога ж поспеху матч са зборнай Швецыі.

У фінале сусветнага турніру зборная Францыі выйграла ў сапернікаў з Даніі — 26:24. У матчы за 3-е месца каманда Германіі ў дадатковы час з мінімальнай розніцай у ліку абыграла зборную Егіпта — 35:34.

**3. Дэйв Льюіс працягне працаваць на пасадзе галоўнага трэнера хакейнай зборнай Беларусі.** Пра тое, што паміж асацыяцыяй «Федэрацыя хакея Рэспублікі Беларусь» і канадскім спецыялістам дасягнута дамоўленасць паведаміў старшыня ФХРБ Ігар Рачкоўскі.

Таксама доўгатэрміновы кантракт падпісаны з асістэнтам галоўнага трэнера нацыянальнай хакейнай дружыны Уладзімірам Бурэ, які адказвае за функцыянальную падрыхтоўку гульцоў.

**4. Пекін прыме зімовыя Алімпійскія гульні 2022 года.** У рамках 128-й сесіі Міжнароднага алімпійскага камітэта ў Куала-Лумпуры адбыліся выбары сталіцы зімовай Алімпіяды 2022 года.

У галасаванні прынялі ўдзел 84 члены МАК. За заяўку Пекіна прагаласавалі 44 чалавекі, а за Алматы (Казахстан) — 40.

XXIV зімовыя Алімпійскія гульні пройдуць з 4 па 20 лютага. Пекін стане першым горадам, які прымае ў сябе як летнюю, так і зімовую Алімпіяду. XXIX летнія Алімпійскія гульні прайшлі ў сталіцы КНР у 2008 годзе.

Таксама на 128-й сесіі МАК абраная сталіца III зімовых юнацкіх алімпійскіх гульняў, якія ў 2020 годзе пройдуць у Лазане. Швейцарскі горад выйграў барацьбу за права іх правядзення ў румынскага Брашава.

**5. Сталі вядомы ўсе ўдзельнікі 1/8 фіналу Кубка Беларусі — 2015/16 па футболе.** Пуцёўкі ў наступную стадыю турніру заваявалі мінскае «Дынама», салігорскі «Шахцёр», «Тарпеда-БелАЗ», «Славія», «Гомель», «Нёман» (Гродна), «Белшына», «Граніт» «Смаргонь», «Іслач», «Слуцк», «Нафтан», «Віцебск», «Дынама» (Брэст), «Мінск» і БАТЭ.

**Вынікі матчаў 1/16:**

«Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «Орша» — 11:1; «Смалявічы-СТІ» — «Дынама» (Мінск) — 2:5; «Шахцёр» (Салігорск) — «Слонім» — 8:1; «Славія» (Мазыр) — «Баранавічы» — 2:0; «Гомель» — «Кобрын» — 4:0; «Граніт» — «Ашмяны» — 5:1; «Нёман» — «Рэчыца-2014» — 6:0; «Белшына» — «Гомельчыгункатранс» — 2:2; «Смаргонь» — «Ліда» — 3:3; «Іслач» — «Хімік» — 3:2; «Слуцк» — «Крумкачы» — 4:0; «Нафтан» (Наваполацк) — «Днепр» (Магілёў) — 3:2; «Бяроза-2010» — «Дынама» (Брэст) — 3:2; «Віцебск» — «Хваля» — 2:0; «Мінск» — «Гарадзея» — 2:0; БАТЭ — «Спартак» — 7:0.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

## ВЫХАВАННЕ СПОРТАМ

**Больш за 50 хлопцаў, якія мелі праблемы з законам і прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці, удзельнічалі ў фінальным турніры абласнога спартыўнага свята «Спорт. Здароўе. Закон» у Гродне.**

Лепшай у міні-футболе стала каманда з Навагрудскага раёна, а ў стрытболе перамаглі сланімчане. Але, па вялікім рахунку, не было і прайграўшых.

— Турнір праходзіць ужо не першы год, — зазначыў **пракурор Гродзенскай вобласці, старшыня абласной федэрацыі футбола Віктар МАРОЗАЎ.** — Безумоўна, не толькі футболам ці баскетболам мы перавыхоўваем моладзь. Аднак хлопцы рыхтуюцца да турніру, трэніруюцца — ужо гэта адрывае іх ад вуліцы. Да таго ж яны вучацца працаваць у камандзе, спазнаюць пачуццё локця. Ёсць і яшчэ адно цікавае назіранне: тыя, хто прайшоў праз гэты турнір, больш парушэнняў не ўчынялі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Жніво-2015

# БОЛЬШ ЗА ЎСІХ НАМАЛАЦІЛІ НА БРЭСТЧЫНЕ

Паводле аператыўнай інфармацыі Мінсельгасхарча, беларускія аграрыі ўжо намалацілі 3 млн 144 тыс. тон збожжа. Збожжавыя і зернебабовыя ўбраны амаль з 40% плошчаў (888 тыс. га з 2 млн 250 тыс. га запланаваных). Па рэгіёнах лідарам з'яўляецца Гомельшчына, дзе ўбрана больш за 73% плошчаў. Далей ідуць Брэсцкая (каля 60%), Магілёўская (40,6%), Мінская (32,8%), Гродзенская (28,2%) і Віцебская вобласці (12,8%). У сярэднім з 1 га сёлета аграрыі ўбіраюць 35,4 ц збожжа, што на 4,4 ц менш за леташні паказчык. Самая высокая ўраджайнасць сёння ў Гродзенскай вобласці — 48,1 ц/га (супраць 49,7 ц/га ў 2014 годзе), у Брэсцкай вобласці з 1 га ўбіраюць 40,7 ц збожжа (у 2014-м — 42,1). Вышэйшая за ўзровень мінулага года ўраджайнасць па-ранейшаму толькі ў Віцебскай вобласці, дзе з 1 га ўбіраюць 31,6 ц супраць 30,1 ц у 2014-м.

Нагадаем, што сёлета пяць абласцей Беларусі плануюць сабраць як мінімум па 1 млн т збожжа.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*




# Хлебны дождж

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



У сельгасцэху Мінскага трактарнага завода, які знаходзіцца ў вёсцы Гайна, пад хлебны клін адведзена 2700 гектараў раллі. Дзвяць камбайнаў беларускай зборкі пад брэндавай назвай «Палессе» шчыруюць з ранку да вечара на спелай ніве, выхопліваючы кожную пагодную хвіліну. У «Гайне» свой парадак на жніве — за кожным камбайнам замацаваны трактар, які адвозіць намалочаны ўраджай. Гэтую місію выконваюць памочнікі камбайнераў. Як толькі змесціва двух камбайнавых бункераў запаўняюць кузаў, «Беларус» новага пакалення





адвозіць збожжа на склад. У апошнія дні надвор'е спрыяе ўборцы, таму вільготнасць коласа мінімальная, а гаспадарка мала траціць часу на прасушку і адразу адпраўляе ўраджай у засекі дзяржавы.

А вось некалькі дзён таму, калі здымаўся гэты фотарэпартаж, надвор'е было не самым спрыяльным — вецер, нізкія хмары, дожджык. Экіпажы спяшаліся завяршыць уборку поля — невялікая колькасць трыцікале заставалася на корані. І раптам у небе зайграла... вясёлка. Але хлебаробы быццам і не заўважалі яе — яны працягвалі працу.

— Вясёлка нясе нам удачу і плён у працы! — усміхаецца кіраўнік гайненскага аддзялення гаспадаркі і былы галоўны аграном Вера Гарахавік. — Хлеб на нашых пагорках вырас добры. Дай, Бог, сабраць яго без страт.

З пачатку жніва ў «Гайне» ўбралі 15 працэнтаў збожжавых, намалацілі ўжо тысячу з паловай тон хлеба.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**
*Лагойскі раён.*

# ЛЯСНЫ ПАЖАР СПРАВАКАВАЎ ДТЗ

## У тушэнні ўзгарання ў лясным масіве Асіповіцкага раёна задзейнічаны нават верталёты

**Ачагі агню ў асіповіцкіх лясах выявілі яшчэ ў нядзелю, але тэрыторыя, на якую распаўсюдзіўся пажар, настолькі вялікая, што барацьба са стыхіяй працягвалася і ў панядзелак.**

Наколькі напружанае становішча, можна казаць ужо па тым, як на мой учарашні тэлефонны званок а чацвёртай гадзіне вечара адрэагавала супрацоўніца Асіповіцкага лясгаса.

— Усе нашы на пажары, у тым ліку і кіраўнік, — паведаміла яна. — Калі жадаеце, магу прадыктаваць вам нумар яго мабільнага. Толькі ён не адкажа, нават калі б вы былі з міністэрства. Не да размоў зараз, лес трэба тушыць.

Па звестках Магілёўскага абласнога лесагаспадарчага аб'яднання, на ліквідацыі пажара працуюць 180 чалавек лясной аховы і 40 адзінак тэхнікі. Ім дапамагаюць 3 баявыя разлікі ратавальнікаў Асіповіцкага і Пухавіцкага раённых аддзелаў па НС і 3 верталёты МНС. Агнём ахоплена ўвогуле каля 70 гектараў лесу ў Асіповіцкім, Татарскім і Цэльскім лясніцтвах. Суцяшае толькі тое, што пажар лакалізаваны і не распаўсюджваецца на новыя тэрыторыі.

— Складанасць у тым, што гэта ўсё багністыя лясы, цяжкадаступныя для звычайнага колавага транспарту, — кажа **начальнік аддзела аховы і абароны лесу Магілёўскага абласнога лесагаспадарчага аб'яднання Юрый ГАЛЕЗНІК.** — Задзейнічана гусенічная тэхніка. Лес паліваюць з верталётаў. Гарацъ не толькі дрэвы, 20% з агульнай плошчы, якая знаходзіцца ў агні, — тарфянікі.

Памеры шкоды, прычыненай лясным пажарам, пакуль ніхто не падлічваў, але тое, што яны будуць вялікімі, і так відавочна.

Тым часам дым ад пажару разам з ранішнім туманам справакаваў у Асіповіцкім раёне сур'ёзную аварыю. У нядзелю на трасе Мінск—Гомель каля вёскі Татарка сутыкнуліся аж 33 аўтамашыны. «Наогул адбылося 12 ДТЗ, дзе былі пашкоджаны машыны, яшчэ ў дзвюх аварыях пацярпелі людзі, — паведаміла **інспектар упраўлення ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Таццяна СТАРАСОТНІКАВА.** — Адзін чалавек знаходзіцца ў рэанімацыі Бабруйскай цэнтральнай бальніцы, а другі ў нейрахірургіі».





На некалькі гадзін пасля аварыі быў перакрыты рух на ўчастку дарогі Мінск—Гомель на агульнай тэрыторыі каля 2 кіламетраў. Зараз абмежаванні знятыя. Супрацоўнікі ДАІ папярэджваюць кіроўцаў, каб яны ў выпадку выяўлення пажару прыпынялі рух і паведамлялі ў аператыўныя службы па тэлефонах 101 і 102.

Дарэчы, на тэрыторыі Асіповіцкага раёна збіраюцца ўвесці забарону на наведванне лесу. Калі ў самы бліжэйшы час не пройдуць дажджы, аналагічныя забароны будуць уведзены на ўсёй тэрыторыі Магілёўскай вобласці, паведамілі ў абласным лесагаспадарчым аб'яднанні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*


## ИЗВЕЩЕНИЕ О РЕАЛИЗАЦИИ ИМУЩЕСТВА ОАО «БАРАНОВИЧИДРЕВ»

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Сведения об организаторе торгов, его место нахождения и контактные телефоны, факс и элек. почта | Председатель ликвидационной комиссии Мищук А.М. ОАО «Барановичидрев», Брестская обл., г. Барановичи, п. Восточный, 3, тел. 8-029-6332490 vel. (029) 8248026 МТС; факс (0163) 453392; mischuk_am@mail.ru |
| 2 | Форма проведения торгов Дата, время и место проведения торгов | Торги в форме аукциона (далее по тексту – торги или аукцион).<br>«04» сентября 2015 года в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, пос. Восточный, 3, административное здание, актовый зал |
| 3 | Сведения о предмете торгов, место нахождения предмета торгов, порядок ознакомления с ним и цена каждого ЛОТА в рублях Республики Беларусь, без учета НДС – 20% | **Лот №1 –** мотоцикл ММВЗ-3.11213 (рег. знак – 40-11БНГ) – 2.928.280 рублей<br>**Лот №2 –** автомобиль ГАЗ-5314-14 (рег. знак АВ 9620-1) инв. №001975 – 26.200.400 рублей<br>**Лот №3 –** автомобиль ГАЗ-5314-14 (рег. знак АВ 9620-1) инв. №001975 – 14.487.280 рублей<br>**Лот №4 –** автомобиль МАЗ 5337 (рег. знак 9750БНН) инв. №002023 – 18.494.400 рублей<br>**Лот №5 –** автомобиль ГАЗ-САЗ-3507-01013 (рег. знак АА4715-1) инв. №090500 – 20.035.600 рублей<br>**Лот №6 –** автомобиль Volkswagen Transporter (рег. знак АА 3129-1) инв. №148 – 69.354.000 рублей<br>**Лот №7 –** автомобиль ГАЗ 2705 – (рег. знак 3223АІ) инв. №090504 – 12.021.360 рублей<br>**Лот №8 –** АВТОМОБИЛЬ МАЗ 5337-1029 (рег. знак АС 1870) инв. №96 – 21.576.800 рублей<br>**Лот № 9 –** ПРИЦЕП ЛТ-191 (рег. знак А 0442А) инв. №022010 – 27.741.600 рублей<br>**Лот №10 –** АВТОМОБИЛЬ МАЗ-54331 (рег. знак АІ 2691-1) инв. №02210 – 13.870.800 рублей.<br>**Лот №11 –** ПОЛУПРИЦЕП VIS Wisbech 421006 (рег. знак А2182 В-1) инв. №461 – 106.342.800 рублей<br>**Лот №12 –** ПОЛУПРИЦЕП ОДАЗ-63571 (рег. знак 4886 БН) инв. № 001999 – 7.089.520 рублей<br>**Лот №13 –** ПРИЦЕП ПСЕ Ф12,5 (рег. знак МЖ 2239) инв. № 001997 – 7.397.760 рублей<br>**Лот №14 –** ПРИЦЕП ПСЕ Ф12,5 (рег. знак ГН 01 67) инв. № 0022045 – 7.089.520 рублей<br>**Лот №15 –** ТРАКТОР МТЗ 82,1 (рег. знак АА 1248) инв. № 090521 – 47.777.200 рублей<br>**Лот №16 –** ТРАКТОР МТЗ 82,1 (рег. знак АА 1250) инв. № 100063 – 40.071.200 рублей<br>**Лот №17 –** АВТОМОБИЛЬ ГАЗ-3307- КО-503 ГН АА-4714-1 инв.; №025000 (вакуумная ассенизационная машина) – 47.777.200 рублей<br>**Лот №18 –** ТО-18Б-АМКАДОР – (рег. знак – АА—1287) – 161.826.000 рублей<br>**ОАО «БАРАНОВИЧИДРЕВ» – п. Восточный, 3. Ознакомление – визуально** |
| 4 | Срок возможного отказа организатора от проведения торгов | Организатор вправе отказаться от проведения торгов по любому из ЛОТОВ в срок не позднее 03.09.2015, проинформировав участников торгов, подавших заявление об участии в торгах, об отказе в их проведении |
| 5 | Сумма шага аукциона | 5% -от начальной цены лота |
| 6 | Начальная стоимость лота- СМ-.п 3 | Установлена: в рублях РБ – без НДС-20% |
| 7 | Порядок уплаты цены предмета торгов победителем торгов | Победитель торгов обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в рублях РБ в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов |
| 8 | Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, необходимые реквизиты текущего расчетного банковского счета продавца, на который должна быть перечислена сумма задатка | 10% от начальной цены лота в рублях РБ<br>Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с-3012122616138 в ф-ле ОАО «БПС-СберБанк», код 369, г. Барановичи<br>Назначение платежа – задаток за участие в аукционе<br>Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению |
| 9 | Требования к участнику торгов | Возмещение победителем торгов расходов по оценке, регистрации капитальных строений и иного имущества, а также по заключению и регистрации сделки купли-продажи и других расходов по проведению аукциона |
| 10 | Место, дата и время начала и окончания приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов | Заявления на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, в срок до 14.00 03.09.2015 г. организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А.М. по адресу: 225320, Брестская обл., г. Барановичи, пос. ВОСТОЧНЫЙ, 3, ОАО «Барановичидрев».<br>Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в торгах |
| 11 | Возмещение затрат на организацию и проведение торгов | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам. Победитель аукциона обязан перечислить на расчетный счет продавца сумму фактических затрат в течение 5 дней со дня проведения аукциона |
| 12 | Порядок оформления участия в торгах | К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный в настоящем извещении срок заявление (с приложением необходимых документов) и внесшие в установленном порядке на указанный в настоящем извещении расчетный счет сумму задатка, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.<br>В день проведения аукциона перед его началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные номера |
| 13 | Критерии выявления победителя торгов | Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.<br>В случае признания аукциона несостоявшимся по какому-то из выставляемых ЛОТОВ в связи с подачей заявления на участие в нем только одним участником предмет торгов может быть продан этому участнику при его согласии по цене торгов, увеличенной на 5 (%) процентов |
| 14 | Порядок оформления результатов торгов | Победитель аукциона в день его проведения подписывает протокол о результатах аукциона по каждому из ЛОТОВ. Протокол подписывается в трех экземплярах всеми присутствующими членами комиссии по проведению аукциона и победителем аукциона. Протокол утверждается организатором аукциона в день его проведения |
| 15 | Срок подписания договора купли-продажи | После подписания копии платежных документов о перечислении затрат на организацию и проведение торгов между продавцом и победителем аукциона заключается договор купли-продажи предмета торгов. Договор купли-продажи предметов торгов (ЛОТОВ) должен быть заключен не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |

# СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

№ 14 (29) Вторник 4 августа 2015 года Для читателей Беларуси, России, Казахстана, Армении, Кыргызстана

Выходит 2 раза в месяц

Издается с 26 апреля 2014 года


# ИНТЕГРАЦИЯ В ДЕЙСТВИИ



Фото БЕЛТА.

**На минувшей неделе Евразийский экспресс дружбы из Южной Кореи в Германию сделал двухчасовую остановку в Бресте. Поездка была организована Министерством иностранных дел Республики Корея и Корейской железнодорожной корпорацией совместно с Российскими железными дорогами. Поезд проследовал по территории Азии и Европы в течение 20 дней и прибыл на конечную точку маршрута — Берлин — в воскресенье. В составе корейской делегации 196 человек: это высокопоставленные чиновники госаппарата Кореи, известные общественные деятели, депутаты, журналисты, артисты, художники.**

**Основной целью проекта является построение логистического моста между Азией и Европой. По дороге запланированы остановки, в том числе в Москве, Варшаве и Берлине, где состоятся или уже состоялись конференции, встречи с представителями органов местной власти, выступления артистов с показом традиционной корейской культуры. «Возлагаем большие надежды на этот экспресс. Надеемся, что он будет служить началу объединения Азии и Европы с точки зрения логистики. Рассматриваются возможности организации регулярного маршрута», — пояснила помощник консула корейского посольства Александра САЛИВОНЧИК.**

# НАШИ ЛЮДИ

## Почетный генеральный консул появился у нашей страны в Сибири

**В прошлый понедельник в Посольстве Беларуси в Москве состоялась церемония вступления в должность первого Почетного генерального консула нашей страны Владимира Шугли. Ранее он был Почетным консулом Беларуси в Тюмени.**

«За результативную работу Владимира Шугли по укреплению торгово-экономического и гуманитарного сотрудничества между Беларусью и Тюменской областью правительством Республики Беларусь было принято решение о назначении его на более высокий пост с расширением консульского округа до территории, охватывающей Тюменскую, Омскую и Курганскую области, — сообщает пресс-служба Министерства иностранных дел нашей страны. — Данное решение было поддержано правительством Российской Федерации». Консульский патент и экзекватуру (документ, удостоверяющий признание консула государством пребывания) Почетному генеральному консулу вручил Чрезвычайный и Полномочный



Посол Республики Беларусь в Российской Федерации Игорь Петришенко. «Омск и Курган — это большие территории, и они, естественно, требуют особого внимания, — отметил Владимир Шугля. — Я думаю, что в упряжке с отделениями посольства, которые там находятся, будем стараться вовлечь регионы в ту работу, которую мы проводим и в Тюмени».

Тюменская область и Республика Беларусь развивают торгово-экономические и культурные связи, используя все возможности для расширения многогранных партнерских отношений. Владимир Шугля, белорус по происхождению, был Почетным консулом нашей страны в Тюмени с 2009 по 2015 год. Благодаря его работе за этот период экспорт наших товаров в Тюменскую область вырос в 2,6 раза, достигнув 135 млн долларов. Владимир Шугля содействовал заключению договоров побратимства между белорусскими и тюменскими городами, открытию выставочно-дилерского центра, где представлена вся белорусская сельхозтехника, активному продвижению продукции «Белшины» в Тюмени и Тюменской области, налаживанию сборки могилевских лифтов в своем регионе, а также открытию сервисного центра Минского автозавода с поставкой 400 МАЗов.

Будучи поэтом, Владимир Шугля всячески стремится укреплять гуманитарное сотрудничество между нашей страной и Тюменской областью, где существует довольно большая белорусская диаспора. Так, к 70-летию Победы была выпущена книга «Победители».

**Надежда ЮШКЕВИЧ.**

**Фото с сайта www.tumentoday.ru**

## НОВОСТИ СОЮЗА

# УНИКАЛЬНАЯ ИДЕНТИФИКАЦИЯ

**Единую систему идентификации участников внешнеэкономической деятельности (ЕСИТС) планируется создать в ЕАЭС**

**Таким образом, Совет Евразийской экономической комиссии признал целесообразным создание рабочей группы по разработке такой системы, сообщают в пресс-службе ЕЭК.**

Создание этой структуры является одним из обязательных условий формирования инфраструктуры электронного документооборота, обеспечивающего бизнес-процессы в цепях поставок, при осуществлении межведомственного и межгосударственного взаимодействия для целей таможенного контроля товаров и транспортных средств, перемещаемых через таможенную границу союза.

| **Условие торгов (условие продажи)** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. |
| **Наличие обременений** | аренда |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «Торговый Дом «Луч-М», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

**Торги проводятся 20 августа 2015 года в 12.00 по адресу:** г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 04.08.2015 по 18.08.2015 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45)** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**ТЕЛЕФОНЫ ДЛЯ СПРАВОК:**
**(017) 327-48-36**
**(УП «Минский городской центр недвижимости»);**
**(029) 636-70-14 (ЗАО «Торговый Дом «Луч-М»).**

## СОБРАНИЕ КРЕДИТОРОВ ЧТУП «АНКОЛ-ИНВЕСТ»

**по защите требования кредитора ЧТОУ «Ленарес-Авто»**
состоится 17.08.2015 г. в 15.00
**в помещении Экономического суда Брестской области по адресу: г. Брест, ул. В. Хоружей, 8.**

С предъявленными требованиями, выносимыми на утверждение собрания кредиторов, можно ознакомиться по адресу нахождения управляющего: г. Брест, ул. Я. Купалы, 3/1, предварительно согласовав время по телефону **8 (029) 728-72-01.**

УНП 290566899

УНП 100223411

## ПРИГЛАШАЕМ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ

Приглашаем принять участие в процедуре переговоров по выбору подрядчика для выполнения текущего ремонта и регуляции запорной арматуры, смесителей, бачков унитазов, сифонов, гибких подводок и их замены в количестве, необходимом для поддержки систем в рабочем состоянии в учреждении образования **«Минский государственный колледж технологии и дизайна легкой промышленности»,** расположенного по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 26.

**С конкурсной документацией можно ознакомиться по адресу:** г. Минск, ул. Матусевича, 26, и (или) на сайте информационной системы «Тендеры» на сайте информационного республиканского унитарного предприятия «Национальный центр маркетинга и конъюнктуры цен» в глобальной компьютерной сети Интернет по адресу: http://www.icetrade.by

**Срок предоставления предложений – с 8.30 04.08.2015 до 12.00 18.08.2015.**
**Проведение вскрытия конвертов – 18.08.2015 в 14.00.**
**Подведение итогов – 19.08.2015 в 12.00.**

**КОНТАКТНЫЕ ТЕЛЕФОНЫ:**
**290 81 48, 365 32 96, 365 27 11; тел. факс 365 30 12.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Клецкий мехзавод» (продавец)

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже грузового бортового автомобиля МАЗ 437143, 2008 г.в., идентификационный номер шасси Y3M43714380000040.

***Начальная цена с НДС 20 % – 61 358 000 белорусских рублей (снижена на 40%).***

**Задаток 10% от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за предмет аукциона производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 10.06.2015 г.

**Аукцион состоится 17.08.2015 в 12.00 по адресу**: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14.08.2015 до 17.00 по адресу:** г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.

**Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71.**
www.cpo.by. Email: auction@cpo.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА

**Гродненский областной исполнительный комитет** (далее – Гродненский облисполком) **ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСОВ** по выбору заказчика (застройщика) по строительству многоквартирных жилых домов №39, №40, №41 в микрорайоне «Южный-3» в г. Гродно (далее – конкурсы).

**Предметы конкурсов:** право выступать заказчиками (застройщиками) по строительству многоквартирных жилых домов №39, №40, №41 в микрорайоне «Южный-3» в г. Гродно.

**Порядок проведения конкурса:** определен Положением о порядке организации и проведения конкурсов по выбору заказчика (застройщика) по строительству многоквартирных жилых домов, **за исключением жилых домов повышенной комфортности,** в г. Минске и областных центрах **(далее – Положение),** утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 10 сентября 2013 г. № 798 (Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь, 19.09.2013, 5/37805).

**Конкурсы проходит в два этапа:**

первый этап – общий предварительный квалификационный отбор;

второй этап – конкурс по выбору заказчика (застройщика) по каждому объекту строительства.

**Наименование объектов строительства:**

«Строительство многоквартирного жилого дома №39 в микрорайоне «Южный 3» в г. Гродно» со встроенными нежилыми помещениями

«Строительство многоквартирного жилого дома №40 в микрорайоне «Южный 3» в г. Гродно» со встроенными нежилыми помещениями

«Строительство многоквартирного жилого дома №41 в микрорайоне «Южный 3» в г. Гродно» со встроенными нежилыми помещениями.

**Организатор конкурса:** Гродненский областной исполнительный комитет.

**Место проведения конкурса:** 230023, Республика Беларусь, г. Гродно, ул. Ожешко, 3, тел. (80152) 73-56-91, 73-56-82.

**Лицо, желающее стать претендентом на участие в конкурсе,** до подачи конкурсного предложения вносит задаток в сумме 18 000 000 (восемнадцать миллионов) белорусских рублей на счет 3642501004003 в филиале № 400 ГОУ «АСБ Беларусбанк» г. Гродно, код 152101752, получатель: Гродненский облисполком, УНП 500199703, ОКПО 00022728, наименование платежа: «Задаток для участия в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству многоквартирных жилых домов в микрорайоне «Южный-3» в городе Гродно». **Желающие стать претендентом на участие в нескольких конкурсах вносят задаток в указанном размере по каждому конкурсу.**

**Дата, время и место приема заявления на участие в конкурсе и прилагаемых к нему документов:** рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений на участие в конкурсе – **1 октября 2015 г. до 13.00. Заявление и документы для предварительного классификационного отбора представляются секретарю конкурсной комиссии по адресу:** 230023, Республика Беларусь, г. Гродно, ул. Ожешко, 3, каб. 203 (управление архитектуры), конт. тел. (80152) 73-56-91, 73-56-82 в запечатанном конверте с надписью «Предварительный квалификационный отбор для участия в конкурсах по выбору заказчиков (застройщиков) по строительству многоквартирных жилых домов №39, №40, №41 в микрорайоне «Южный 3» в городе Гродно» «Не вскрывать!». На конверте указывается наименование претендента. Образец заявления и документы, подтверждающие экономическое и финансовое положение претендента, предусмотренные пунктами 5, 6 Положения. **К дальнейшему участию в конкурсе допускаются претенденты, прошедшие предварительный квалификационный отбор.**

**Дата, время и место проведения предварительного квалификационного отбора: 2 октября 2015 г. в 15.00 по адресу:** 230023, Республика Беларусь, г. Гродно, ул. Ожешко, 3, каб. 416.

**Дата, время и место приема конкурсных предложений и прилагаемых к ним документов:** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема – **19 октября 2015 г.** Претендент представляет секретарю конкурсной комиссии по адресу: 230023, Республика Беларусь, г. Гродно, ул. Ожешко, 3, каб. 203 (конт. тел. (80152) 73-56-91, 73-56-82) по каждому объекту строительства, по которому он желает участвовать в конкурсе, отдельное конкурсное предложение с надписью «Конкурсное предложение по выбору заказчика (застройщика) по строительству многоквартирного жилого дома №00 (указать позицию) в микрорайоне «Южный-3» в г. Гродно» «Не вскрывать!». Конкурсное предложение формируется в полном объеме согласно приложению 6-й конкурсной документации. Претендент имеет право отозвать свое конкурсное предложение в любое время, но не позднее 5 (пяти) календарных дней до даты проведения заседания конкурсной комиссии по выбору победителя конкурса. **В соответствии с пунктом 37 Положения конкурс, на участие в котором не было подано ни одного заявления, либо заявление на участие в котором подано только одним претендентом, либо для участия в котором явился только один претендент, либо никто не явился, либо по результатам конкурса отклонены все предложения, либо претендент-победитель отказался от заключения договора, признается несостоявшимся.**

**Дата, время и место заседания конкурсной комиссии по вскрытию конвертов с конкурсными предложениями с участием представителей претендентов:** 20 октября 2015 г. в 11.00 по адресу: 230023, Республика Беларусь, г. Гродно, ул. Ожешко, 3, каб. 303

**Дата, время и место выбора победителя:** 20 октября 2015 г. по адресу 230023, Республика Беларусь, г. Гродно, ул. Ожешко, 3, каб. 303, по каждому объекту строительства будет определен победитель. Претенденту, не победившему в конкурсе, возвращается задаток в течение 5 (пяти) рабочих дней после подведения итогов по выбору победителя.

**Срок подписания договора на реализацию права строительства объекта, заключаемого по результатам конкурса:** не позднее 10 ноября сентября 2015 г. Существенные условия последующей сделки оговариваются в планируемом к заключению договоре на реализацию права строительства объекта.

**Условия проведения конкурса, состав конкурсного предложения, перечень прилагаемых к нему документов** отражены в Конкурсной документации. Конкурсная документация представляется претендентам секретарем конкурсной комиссии не позднее 3 (трех) рабочих дней после внесения задатка на участие в конкурсе по адресу: 230023, Республика Беларусь, г. Гродно, ул. Ожешко, 3, каб. 724 (конт. тел. (80152) 73-56-91, 73-56-82).

**Срок, в течение которого организатор конкурса может реализовать свое право на отказ от проведения конкурса:** в любое время, но не позднее 5 (пяти) календарных дней до даты проведения заседания конкурсной комиссии по определению результатов предварительного квалификационного отбора претендентов.

**Сведения об участке строительства:** земельные участки расположены в границах нового жилого микрорайона «Южный-3». Участки свободны от застройки. Гидрогеологические условия позволяют вести капитальное строительство.

**Сведения об объектах строительства:**

**многоквартирный жилой дом №39:** двухсекционный 13–15-этажный многоквартирный жилой дом со встроенными нежилыми помещениями, с обустройством прилегающего участка. Особые условия: использование части 1-го этажа под встроенную амбулаторию;

**многоквартирный жилой дом №40** двухсекционный 13–15-этажный многоквартирный жилой дом со встроенными нежилыми помещениями, с обустройством прилегающего участка. Особые условия: использование части 1-го этажа под встроенную сберкассу;

**многоквартирный жилой дом №41** двухсекционный 13–15-этажный многоквартирный жилой дом со встроенными нежилыми помещениями, с обустройством прилегающего участка. Особые условия: использование части 1-го этажа под встроенную аптеку и парикмахерскую.

**Технико-экономические характеристики объектов строительства представлены в приложении 2 Конкурсных документаций.**

**Возмещение затрат на организацию и проведение конкурса:** расходы по публикации извещений в средствах массовой информации, затраты на подготовку конкурсной документации и ее тиражирование, проектно-изыскательские работы, почтовые, канцелярские и другие расходы, предусмотренные законодательством, осуществляются победителем конкурса в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подведения результатов конкурса и до подписания договора на реализацию права на строительство объекта. Организатору конкурса представляются заверенные надлежащим образом копии платежных документов, подтверждающих возмещение расходов на организацию и проведение конкурса.

**Информация о проведении конкурсов, в том числе перечень документов для предварительного квалификационного отбора, а также формы документов,** предоставляемых претендентами конкурса, размещена на официальном интернет-портале Гродненского облисполкома http://grodno-region.gov.by.

# ПАМІЖ АФРЫКАЙ І ЕЎРАЗІЯЙ

**Нядаўна паспяхова прайшлі выпрабаванні аднаго з ключавых сучасных транспартных аб'ектаў свету — другой чаргі Суэцкага канала. Некалькі кантэйнеравозаў пад сцягамі розных краін пераадолелі 72-кіламетровы адрэзак, пракладзены паралельна старому. Афіцыйнае адкрыццё запланавана на 6 жніўня.**

## ХУТКІЯ ІНВЕСТЫЦЫІ

Канал быў збудаваны ўсяго за год супраць 11 гадоў, што спатрэбіліся ў XIX стагоддзі для будаўніцтва першай чаргі, і абышоўся ў 8,5 мільярда долараў. Як чакаецца, другі Суэц дазволіць павялічыць прыбытак егіпецкага бюджэту ад эксплуатацыі воднага шляху з цяперашніх 5,3 мільярда да 13,2 мільярда долараў за год. Такім чынам, усе ўкладанні акупяцца даволі хутка, а пасля — чысты даход.

Для таго, каб дакладна ўяўляць прадмет, крыху пра ўласна Суэц, які дагэтуль, так бы мовіць, быў у адзіночным ліку. Гэта канал (па-арабску гучыць як «кана ас-Сувайс») паміж Міжземным і Чырвоным морамі. Перасякае Суэцкі перашыек. Праход судна па Суэцкім канале дазваляе трапіць з Атлантыкі праз Міжземнае мора ў Індыйскі акіян, не агінаючы Афрыку.

Суэц уяўляе сабою нешлюзаваны злучальны канал паміж портамі Порт-Саід на Міжземным моры і Порт-Тауфік на Чырвоным. Агульная даўжыня разам з падходнымі пляцоўкамі складае 174 кіламетры, у тым ліку па перашыйку — 162,5 км. Частка трасы праходзіць па фарватары ў азёрах Тымсах, Вялікім і Малым Горкіх, па дне якіх пракладзены марскія каналы. Найменшая шырыня — 300 метраў, шырыня фарватара паміж бакенамі — 180 м. Найбольшая дазволеная асадка суднаў — 53 футы, глыбіня канала — ад 19,5 да 20 м.

Мэта праекта па будаўніцтве другой чаргі Суэца — забяспечыць двухбаковы рух воднага транспарту. Дагэтуль судны выстройваліся ў караван і ішлі ў адзін бок. Праз некаторы час другі караван праходзіў у зваротным кірунку. У далейшым з поўдня на поўнач судны будуць праходзіць па старым, а з поўначы на поўдзень — па новым рэчышчы. Што ў выніку дазволіць пазбегнуць затораў і чакання, скароціць час праходжання канала з 18 да 11 гадзін і павялічыць сутачную прадукцыйнасць з 49 да 97 караблёў.

Гэты гідратэхнічны аб'ект нездарма лічыцца адным з ключавых ва ўсім свеце. Як вядома, Суэцкі канал забяспечвае 7% сусветнага марскога грузазвароту, мае ключавую ролю ў забеспячэнні Еўропы блізкаўсходняй нафтай. Яго прынята лічыць умоўнай мяжой паміж Афрыканскім кантынентам і Еўразіяй. Для Егіпта Суэц з'яўляецца другой пасля турызму крыніцай валютных прыбыткаў і прадметам нацыянальнага гонару. Пры гэтым відавочна, што ўжо ў найбліжэйшай перспектыве менавіта паступленні ад транзіту за канал маюць усе перспектывы стаць вызначальнымі.

## СПАДЧЫНА ФАРАОНАЎ

Першы Суэцкі канал быў пабудаваны пры егіпецкім фараоне Неха II (канец VII — пачатак VI ст. да н.э.), але потым прыйшоў у занядад. У новы час ідэю пракладкі кароткага воднага шляху паміж Еўропай і Азіяй прапанаваў у 1849 годзе колішні французскі консул у Александрыі Фердынанд Лесэпс, чый бацька, Жан Лесэпс, браў удзел у экспедыцыі Лаперуза, праехаў ад Петрапаўлаўска-Камчацкага да Парыжа і ўзначальваў грамадзянскую адміністрацыю Масквы падчас яе акупацыі войскамі Напалеона.

У 1854 годзе Лесэпс стварыў франка-егіпецкую Усеагульную кампанію Суэцкага канала і атрымаў канцэсію ад егіпецкага хедыва (пасля долю ўрада Егіпта выкупілі брытанскія фундатары). У 1859 годзе пачалася будоўля, якую ўзначаліў Лесэпс, і 17 лістапада 1869 года канал уступіў у эксплуатацыю.

У 1956 годзе егіпецкі прэзідэнт Гамаль Абдэль Насер нацыяналізаваў Суэцкі канал. Брытанія і Францыя пры спрыянні Ізраіля распрабавалі сілай вярнуць сваю ўласнасць, але беспаспяхова, бо СССР актыўна падтрымаў Егіпет, а ЗША занялі пазіцыю неўмяшання.

**Агінаць Афрыку вельмі нявыгадна. Шлях вакол Чорнага кантынента і праход праз Гібралтар даўжэйшы за дарогу праз Суэц на восем тысяч кіламетраў. Пры гэтым трэба ўлічваць час і небяспекі ў дарозе, звязаныя з няўстойлівым надвор'ем у восеньскі перыяд.**

Пасля Шасцідзённай вайны 1967 года канал зрабіўся размежавальнай лініяй паміж Егіптам і Ізраілем, але і тады суднаходства па ім не спынялася. Па Кэмп-Дэвідскім пагадненні 1978 года Егіпет вярнуў сабе кантроль над Сінайскім паўвостравам.

## І ПРЭСТЫЖ, І ГРОШЫ

Новы канал, як і ранейшы, будзе дзяржаўнай уласнасцю. Будоўля фінансавалася з унутраных крыніц. Егіпецкі ўрад выпусціў пазыку пад 12% гадавых, і буйныя і дробныя фундатары раскупілі аблігацыі цягам усяго васьмі дзён. Работа вялася кругласутачна пры маштабным удзеле інжынерных частак егіпецкага войска.

Урачыстая закладка канала ў жніўні мінулага года суправаджалася пампезным паветраным парадам і аптымістычнымі прамовамі. Прэзідэнт Фатах-аль-Сісі назваў праект «вялікай марай Егіпта» і «каналам росквіту», паабяцаўшы нацыі эканамічны ўздым і ўзрост занятасці.

Кіраўнік адміністрацыі Суэцкага канала адмірал Мохаб Маміш казаў пра «новае нараджэнне краіны» і назваў будоўлю «мірнай бітвай за развіццё». «Як і нашы продкі 150 гадоў назад, мы будуем канал для нашых дзяцей і ўнукаў і для ўсяго чалавецтва», — заявіў ён агенцтву BBC. Па словах міністра інвестыцый Ашрафа Салмана, праект «верне Егіпет на карту свету» пасля перыяду нестабільнасці.

Зразумела, не абышлося і без незадаволеных. На думку крытыкаў рэжыму, грошы лепш было б выдаткаваць на паляпшэнне інфраструктуры Каіра і іншых егіпецкіх гарадоў, што пакутуюць ад перанасялення. Аднак шэраг экспертаў лічаць інакш. «Для ўлад гэта перш за ўсё патрыятычнае распачынанне, сэнс якога не зводзіцца выключна да грошай», — заявіў фінансавы аналітык Энгус Блэр, які жыве ў Егіпце. Хаця, будзем справядлівымі, і з грашыма ў гэтым праекце ўсё нармальна. Дзякуючы ўдаламу геаграфічнаму становішчу Егіпет мае стабільную крыніцу фінансавых паступленняў. Гэта той шанц, якім грэх не скарыстацца. І перспектыўны кірунак усяляк развіваюць. Пацвярджэннем таму — адкрыццё другой чаргі Суэца.

## БЕЗ ЭКСЦЭСАЎ. АЛЕ З КУР'ЁЗАМІ

Выпрабаванні праходзілі пад кантролем баявых караблёў і верталётаў, бо Сінайскі паўвостраў, што знаходзіцца на ўсходзе ад канала, вядомы як база радыкальных ісламістаў. Аднак усё прайшло без эксцэсаў.

Нягледзячы на палітычныя пертурбацыі апошніх гадоў, работа Суэцкага канала ні разу не парушалася. Адзіны інцыдэнт — абстрэл з гранатамёта замежнага кантэйнеравоза, якому прычынілі нязначную шкоду — адбыўся 31 жніўня 2013 года. На наступны дзень адмірал Маміш асабіста праплыў па канале ў абодвух кірунках, каб давесці, што з ім усё ў парадку.



Суэцкі канал запатрабаваны сярод усіх тыпаў суднаў.

Пачатковая фаза будаўніцтва другой чаргі Суэца суправаджалася тэхнічнымі надзвычайнымі здарэннямі: затапленнем часткі рэчышча і абвальваннем моставага пераходу, аднак ахвяр не было. Здарыліся і самыя сапраўдныя кур'ёзы: егіпецкае паштовае ведамства выпусціла ў гонар праекта марку, на якой памылкова быў намаляваны... Панамскі канал.

## НАФТАВАЯ ПЕРСПЕКТЫВА

Зразумела, кожная справа павінна мець сваю перспектыву. Так і з Суэцкім каналам. На першы погляд, для маштабнага пашырэння не было сур'ёзных падстаў. Суэц па-ранейшаму з'яўляецца асноўным маршрутам экспартных грузаў, перш за ўсё з Кітая. Якіх-небудзь заўважных альтэрнатыў тут не праглядаецца — егіпцяне цудоўна разумеюць, што агінаць Афрыку вельмі нявыгадна. Шлях вакол Чорнага кантынента і праход праз Гібралтар даўжэйшы за дарогу праз Суэц на восем тысяч кіламетраў. Пры гэтым трэба ўлічваць час і небяспекі ў дарозе, звязаныя з няўстойлівым надвор'ем у восеньскі перыяд. Нават пагроза захопу судна самалійскімі піратамі падштурхоўвала да пошуку альтэрнатывы Суэцу далёка не ўсіх: дзясяткі суднаўласнікаў плацілі выкуп за захопленыя судны і экіпажы, бо аддавалі перавагу рызыцы перад стратай часу. Тым больш што свае ўмовы дыктуюць кліенты, якія зацікаўлены ў хуткай дастаўцы.

І гэта нягледзячы на сапраўды важкія транспартныя тарыфы. Для таго, каб дакладна ўяўляць парадак лічбаў, варта ўзгадаць пра рэкордную суму, атрыманую некалькі гадоў таму за праход па Суэцкім канале. Звыш двух мільёнаў долараў заплаціў уладальнік грузавога італьянскага судна. Гэта была цэлая аперацыя, якая доўжылася без малога суткі. Велізарнае грузавое судна, што належыць італьянскім суднаўласнікам, перавозіла негабарытны груз, прызначаны для нафтавых платформаў. Вага грузу склала 59 тысяч тон.

Плата за праход па Суэцкім канале грузавога судна — 2 мільёны 28 тысяч долараў — дарэчы, цалкам супастаўная з той, якую выдаткоўваюць буйныя авіяносцы, што праходзяць з Міжземнага мора ў Чырвонае. І ўсё ж, на думку журналістаў егіпецкай газеты «Аль-Ахрэм», італьянскае судна заплаціла самую высокую ў гісторыі цану за праход праз Суэц. Яна атрымліваецца з некалькіх складнікаў: натуральна, за карыстанне самім каналам, а таксама — з аплаты страхоўкі, працы тэхнічных службаў і мясцовых лоцманаў, без якіх праход па канале забаронены. Кошт страхоўкі досыць высокі, бо калі такое велізарнае судна з грузам заграсне ці сядзе на мель у Суэцкім канале, то адразу перакрые ўсю водную артэрыю, што злучае два моры.

Так што сітуацыя вакол Суэца, здавалася б, зусім бясхмарная, і сама падштурхоўвае суднаўласнікаў да праходу менавіта праз Суэц. Але не ўсё так адназначна. Апошнім часам прапрацоўваецца магчымасць стварэння канкурэнтнага шляху па паўночных морах, што значна карацей, чым праз Чырвонае і Міжземнае. А таксама бяспечней, улічваючы неспакойнае становішча ў раёне Самалі і некаторых краінах Блізкага Усходу. Каб вытрымаць канкурэнцыю і забяспечыць хуткі праход праз канал, улады Егіпта і пачалі цяперашняе будаўніцтва. Апроч канала, будзе створана вялікая інфраструктура — таксама плануецца пракапаць сем аўтамабільных і чыгуначных тунэляў у раёне Ісмаіліі і Порт-Саіда, якія звяжуць афрыканскую частку краіны з Сінайскім паўвостравам. Выдаткі на іх будаванне ацэньваюцца яшчэ ў 28 млрд егіпецкіх фунтаў (каля 3,92 млрд долараў).

Далейшыя перспектывы развіцця і, галоўнае, запатрабаванасці Суэцкага канала вызначае яшчэ адна глабальная акалічнасць. З'явілася інфармацыя аб тым, што ў заліве Чырвонага мора знайшлі буйныя запасы нафты. Тут на плошчы 20 тысяч квадратных кіламетраў адкрыты 44 радовішчы «чорнага золата», з іх 29 — марскіх. Ужо сёння праз канал штодня праходзіць парадку 2,2 мільёна барэляў нафты (каля 2,6% сусветнай здабычы і 8% гандлю), і гэты паказчык будзе павялічвацца. На думку спецыялістаў, менавіта нафтаперавозка ў найбліжэйшай перспектыве стане вызначальнай для Суэца.

**Падрыхтаваў Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

*litvinov@zviazda.by*



Гэты гідратэхнічны аб'ект нездарма лічыцца адным з ключавых ва ўсім свеце.

# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЖНІВЕНЬ



**4 жніўня, аўторак.** Вельмі каварнае становішча Месяца для стрыжкі. Існуе рызыка выпадзення валасоў, аблысення і страты сувязі з космасам.

**5 жніўня, серада.** Стрыжка ў гэты дзень паскарае рост валасоў са стратай іх якасці, а значыць, ён неспрыяльны для стрыжкі.

**6 жніўня, чацвер.** Стрыжка валасоў і новая прычоска будуць вам да твару і паспрыяюць узмацненню асабістага абаяння, поспеху ў навакольных.

**7 жніўня, пятніца.** Неспрыяльны месяцовы дзень для стрыжкі валасоў.

**8 жніўня, субота.** Стрыжка будзе ўдалай, асабліва лёгкая і паветраная прычоска.

**9 жніўня, нядзеля.** Выдатны дзень для стрыжкі і афарбоўвання. Вітаюцца смелыя эксперыменты, стварэнне лёгкіх паветраных прычосак, меліраванне і афарбоўванне.

**10 жніўня, панядзелак.** Не зусім ўдалы дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Стрыжка можа не спадабацца.

**11 жніўня, аўторак.** Сёння яшчэ адзін неспрыяльны дзень для стрыжкі, ад афарбоўвання таксама лепш устрымацца.

**12 жніўня, серада.** Устрымайцеся ад стрыжкі, могуць здарыцца непрыемнасці са здароўем.

**13 жніўня, чацвер.** Добры час для наведвання цырульніка. Пасля стрыжкі ў гэты перыяд валасы добра растуць, умацоўваюцца, набываюць устойлівасць да знешніх уздзеянняў, менш сякуцца.

**14 жніўня, пятніца.** Гэты дзень таксама выдатна падыходзіць для наведвання цырульніка.

**15 жніўня, субота.** Добры дзень для аздараўлення валасоў. Стрыжка зробіць іх пышнымі і густымі.

**16 жніўня, нядзеля.** Стрыжка ў гэты дзень зробіць валасы больш густымі і ўмацуе іх.

**17 жніўня, панядзелак.** Абавязкова зрабіце ў гэты дзень стрыжку. Ці хаця б падстрыжыце грыўку — яна дабавіць вобразу запалу, а на ўзроўні энергетыкі дапаможа засваенню новай інфармацыі.

**18 жніўня, аўторак.** Стрыжка прынясе прыгожы колер твару, палепшыць ваш дабрабыт.

**19 жніўня, серада.** Пасля стрыжкі ў гэты дзень валасы растуць даволі хутка, але іх якасць і структура не мяняюцца.

**20 жніўня, чацвер.** Стрыжка ў гэты дзень робіць валасы непаслухмянымі, хоць тым, хто жадае, каб яны мелі схільнасць да завівання, гэта можа быць і на карысць.

**21 жніўня, пятніца.** Нейтральны дзень для стрыжкі.

**22 жніўня, субота.** Сёння сатанінскія 9-месяцовыя суткі, стрыгчы валасы і афарбоўваць не рэкамендуецца.

**23 жніўня, нядзеля.** Абавязкова падстрыжыце валасы ў гэты дзень, каб зрабіць сваё жыццё больш яркім і цікавым.

**24 жніўня, панядзелак.** Часта мы ідзём у салон не таму, што ўжо час, а таму што проста хочацца нейкіх перамен. Сёння — менавіта той месяцовы дзень, калі абрэзаная грыўка можа кардынальна змяніць ваш лёс.

**25 жніўня, аўторак.** Добры дзень для стрыжкі валасоў, пазногцяў і наогул догляду за сваёй знешнасцю.

**26 жніўня, серада.** Добра стрыгчы валасы тым, у каго аслабленае фізічнае здароўе і каму надакучыла манатоннасць у жыцці, каму не хапае актыўнасці, смеласці і валявых якасцей.

**27 жніўня, чацвер.** Дзень для стрыжкі абсалютна нейтральны, ні на што не будзе ўплываць.

**28 жніўня, пятніца.** Добры час для правядзення нестандартных стрыжак.

**29 жніўня, субота.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі, афарбоўвання і завіўкі валасоў. Калі пастрыгчы валасы ў гэты дзень, яны стануць непаслухмянымі і калматымі, стрыжцы не ўдасца надаць патрэбны выгляд, прычоска атрымаецца бясформеннай.

**30 жніўня, нядзеля.** Сёння ўстрымайцеся ад любых цырульніцкіх працэдур — вы наўрад ці атрымаеце добры вынік.

**31 жніўня, панядзелак.** Стрыжка ў гэты дзень можа аслабіць імунітэт і павысіць рызыку захворванняў.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.29 | 21.01 | 15.32 |
| Віцебск — | 5.14 | 20.56 | 15.42 |
| Магілёў — | 5.19 | 20.51 | 15.32 |
| Гомель — | 5.22 | 20.41 | 15.19 |
| Гродна — | 5.46 | 21.15 | 15.29 |
| Брэст — | 5.54 | 21.08 | 15.14 |

### Месяц

*Апошняя квадра 7 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

***Пр.*** *Марыі, Аляксея, Міхаіла.*
***К.*** *Дамініка, Яна.*



Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 4 ЖНІЎНЯ

**1668** год — з'явілася першае шампанскае. Манах-бенедыктынец П'ер Перыньён, працуючы эканомам пры абацтве Атвільер, размешчаным у самым цэнтры правінцыі Шампань, загадваў харчовымі запасамі і склепам, а ў вольны час займаўся эксперыментамі па вытворчасці розных вінаў. І вось, 4 жніўня 1668-га Перыньён прадставіў здзіўленай брацii цудоўны напой: серабрыстыя бурбалкі з ціхім шолахам падымаліся з дна куфля, празрыстая пена іскрылася, нібы жывая. Гэтае пеністае віно стала прабацькам сучаснага шампанскага, а імя Перыньён — маркай французскага шампанскага прэміум-класа.

**1869** год — нарадзіўся Станіслаў Станіслававіч Богуш-Сестранцэвіч, беларускі графік і жывапісец. Вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Шмат падарожнічаў па Беларусі і Літве. У жанравых творах адлюстраваў побыт беларускіх і літоўскіх сялян і гараджан. Аўтар ілюстрацый да апавядання Э. Ажэшкі «Гедалі», графічных лістоў «У мястэчку», «Праца ў фальварку», «Цыганы» і інш. Творчасць мастака аказала ўплыў на развіццё беларускай станковай і кніжнай графікі канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Памёр у 1927 годзе.



***Споўнілася 60 гадоў з дня нараджэння (вёска Свадбічы Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці) Віктара Аляксандравіча ГУМІНСКАГА, намесніка Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Віктар Аляксандравіч скончыў Новасібірскае вышэйшае ваенна-палітычнае агульнавайсковае вучылішча, Ваенна-палітычную акадэмію імя К. Готвальда (ЧССР), Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Праходзіў ваенную службу на пасадах намесніка камандзіра роты, батальёна, палка па палітычнай частцы, намесніка начальніка палітаддзела танкавай дывізіі, намесніка камандзіра танкавай дывізіі, начальніка аддзела 7-й танкавай арміі, начальніка аддзела 65-га армейскага корпуса, намесніка камандзіра па выхаваўчай рабоце 65-га армейскага корпуса Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога, трэцяга, чацвёртага і пятага скліканняў. З'яўляецца намеснікам старшыні савета рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», старшынёй Мінскай абласной арганізацыі РГА «Белая Русь». Узнагароджаны ордэнам Айчыны III ступені, ордэнам Пашаны, медалямі Рэспублікі Беларусь і СССР, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.***

***Ад імя ўсіх чытачоў парламенцкай і ўрадавай газеты віншуем Віктара Аляксандравіча з прыгожым юбілеем!***

### Было сказана

**Пятро МАКАЛЬ, паэт**

*«Сталасць — гэта прага дасканаласці, у якой няма ў жыцці мяжы».*

## Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

ХРЫШЧЭННЕ дзіцяці: выбар дня.

◈ Пахрысціць дзіця стараліся да 40 дзён пасля яго нараджэння. Гэта было абумоўлена тым, што дзіцяці жадалі як мага хутчэй даць імя і разам з імем — святога-ахоўніка. Акрамя гэтага, згодна з царкоўнай традыцыяй, на 40-вы дзень пасля родаў выконваецца абрад уцаркаўлення маці і яе дзіцяці (справа ў тым, што пасля родаў жанчына 40 дзён не мела права заходзіць у храм).

◈ Вялікім грахом у народзе лічылася смерць няхрышчанага дзіцяці. Таму, калі немаўлятка нараджалася хворым і было відаць, што яно хутка памрэ, вядомы факты, што бабка-павітуха сама хрысціла нованароджанага.

◈ Нашы разумныя продкі для хрышчэння стараліся выбраць самы спрыяльны дзень. Хрысціць дзіця можна ў любы дзень. Але звычайна хрысцілі ў нядзелю — самы светлы і святы дзень тыдня, а яшчэ лепш — у дзень якога-небудзь царкоўнага свята. Так, лічылася, калі пахрысціць дзіця на Вадохрышча, у яго будзе шчаслівы лёс. Але асцерагаліся хрысціць у святы, звязаныя са смерцю, напрыклад 28 жніўня, на Успенне Багародзіцы.

◈ Пры выбары дня хрышчэння дзіцяці абавязкова ўлічвалі перыяд росту Месяца (маладзік), які аказваў станоўчы ўплыў на далейшы лёс дзіцяці.

◈ У кожнай хаце абавязкова быў спіс неспрыяльных або «чорных» дзён. У такія дні асцерагаліся выконваць абрад хрышчэння.

◈ Акрамя гэтага, неабходна было ўлічваць структуру пастоў — адна- і шматдзённых.

◈ Блізнят ці двайнят стараліся пахрысціць у розныя дні, кожнаму выбіралі сваю пару хросных бацькоў.

◈ У дзень хрэсьбін бацькам і самым блізкім родным дзіцяці неабходна было пазбягаць шыць, вязаць, прасці, ткаць, секчы дровы, капаць зямлю, забіваць свойскую жывёлу і г.д. Любыя хатнія справы трэба было зрабіць загадзя ці па магчымасці адкласці на другі дзень. Недапушчальнымі былі ніякія сваркі паміж роднымі нованароджнага.

◈ У гэты дзень добра было бацькам пералічыць усе грошы, якія былі ў хаце, каб дзіцё было багатым; частаваць людзей пірагамі, але ні ў якім разе не блінцамі (таму што яны лічацца асноўным атрыбутам жалобнага стала).

## УСМІХНЕМСЯ

**Дачка звяртаецца да бацькі, які глядзіць футбол.**

**— Тата, выключы на хвілінку тэлевізар, мне трэба з табой пагаварыць.**

**— Я выключу гук, кажы.**

**— Ніяк не магу вырашыць, на які факультэт медінстытута мне лепш паступіць — на кардыялагічны або на стаматалагічны.**

**— А колькі ў чалавека зубоў?**

**— Трыццаць два.**

**— А сэрца?**

**— Адно.**

**— Лік 32:1 на карысць стаматалагічнага.**

Колькі мужа ні кармі, на наступны дзень ён як быццам і не еў зусім.

**Два мужыкі:**

**— Вяртаюся я тут учора дадому з пяццю літрамі піва, спатыкнуўся на лесвіцы, ледзьве не ўпаў!**

**— І што, разліў?**

**— Не, я сціснуў зубы мацней і рота так і не раскрыў.**

Пасля таго як падслепаватая старая ўключыла на кухні святло, нахабны прусак не ўцёк, а мяўкнуў і пацёрся аб нагу бабулькі.




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3040.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 жніўня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12